# Ладзілі свята Каласок з Купалінкай

**Адкрыццё тыдня дзіцячай кнігі ў дзіцячым філіяле Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага аб'яднала малодшых школьнікаў горада, выхаванцаў Панямунскага дзіцячага дома, настаўнікаў, бацькоў, пісьменнікаў.**

Дзед Усявед, Каласок і Купалінка, Смех, Пеўнік і іншыя героі сышлі са старонак казак, апавяданняў і вершаў, каб сустрэцца з маленькімі чытачамі. Значная ўвага надавалася творам Янкі Купалы і Якуба Коласа, да юбілеяў якіх і ладзілася свята. Песні, танцы, загадкі, прыказкі і прымаўкі, гульні, віктарыны і бездакорнае гучанне беларускай мовы яшчэ раз пераканалі ў неабходнасці праўядзення работы па прыцягненні дзяцей да чытання, прывіцці ім любові да друкаванай кнігі, выхаванні літаратурнага густу, уменні не разгубіцца ў бясконцым кніжным акіяне і патрапіць на самыя каштоўныя каралы.

У якасці пачэснага госця быў запрошаны паэт з Мінска, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» Уладзімір Мазго. З удзячнасцю прынялі ад вядомага пісьменніка кнігі ў дар бібліятэцы.

Удзельнікі свята, пераможцы конкурсаў на лепшы малюнак, водгук на кнігу і самыя актыўныя чытачы беларускай кнігі атрымалі памятныя і салодкія падарункі.

**Людміла КЕБІЧ,**
**старшыня абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі»**